

# Юнацтва і талент

**Неад'емнай часткай культурнага жыцця рэгіёна і знакавым музычным праектам краіны назваў міністр культуры Беларусі XX Міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні "Халі-Хало", які праходзіў у Наваполацку 15 і 16 лістапада.**

Для ўдзелу ў творчым спаборніцтве было пададзена 142 заяўкі. У фінале за гран-пры змагаліся 45 спевакоў ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў з Арменіі, Беларусі і Расіі.

Цырымонія адкрыцця разгарнулася ў Палацы культуры "Нафтан". Прывітальнае слова міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча агучыў намеснік начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Дзмітрый Слясарчык.

— Гэта папулярны і прэстыжны творчы праект, які на працягу многіх гадоў аб'ядноўвае маладыя таленты, садзейнічае іх прафесійнаму развіццю.

Пачаўшы сваю гісторыю з 1994-га, конкурс з кожным разам рабіўся больш прывабным, цікавым і разнастайным. З дня яго заснавання на нашых вачах вырасла цэлае пакаленне таленавітых артыстаў. Сёння рэспубліканскі конкурс "Халі-Хало" — добрае сведчанне таго, што ў краіне паслядоўна выяўляецца, развіваецца і рэалізоўваецца багаты інтэлектуальны і творчы патэнцыял маладзёжнай культуры.

Асаблівыя словы ўдзячнасці ўсім, хто стаяў ля вытокаў зараджэння конкурсу. Падзяка тым, хто працягвае гэтую важную місію — гадуе і выхоўвае юныя таленты, адкрывае новыя імёны, якімі будзе ганарыцца наша родная Беларусь, — гаворыцца ў адрасе.



Традыцыйна ў склад журы ўвайшлі вядомыя беларускія і замежныя артысты, кампазітары, педагогі, арганізатары буйных музычных конкурсаў. Узначаліла іх заслужаная артыстка Беларусі, дацэнт кафедры мастацтва эстрады Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ірына Дарафеева.

Усе фіналісты, як заўважылі члены судзейскай калегіі, яскрава праявілі сябе на сцэне. Лаўрэатамі трэцяй ступені ў сваіх узроставых групах сталі Нарэ Петрасян з Арменіі, Мілана Малахава з Магілёва і Міхаіл Шаўлякоў з Расіі. Другія месцы заваявалі беларускі Аляксандра Савацкая, Эвеліна Захаранка і Кацярына Кляшчонак, а першыя — Святлана Караблёва з Санкт-Пецярбурга, Лаура Лагута з Заслаўя і Дар'я Раманава з Пскова. Прыз сімпатый гледачоў атрымала Валерыя Шарстук з Магілёва, а спецпрыз ад старшыні Наваполацкага гарвыканкама ўручылі Марыі Баран з Наваполацка.

Гран-пры журы прысудзіла 12-гадовай Лізавеце Цупрык з Брэста. Пераможцы падарылі прафесійны мікрафон. Дзяўчынка, дарэчы, ужо спрабавала свае сілы ў конкурсе два гады таму.

Па агульным прызнанні ўдзельнікаў, юбілейны "Халі-Хало" прынёс мноства каштоўнага вопыту і натхнення. Адкрыў сёлетні фестываль і яркія таленты, здольныя зрабіць свой унёсак у развіццё беларускай і агульнасусветнай культуры.